# Дамоўленасці — у канкрэтныя праекты

## У апошні час міжнародная дзейнасць Міністэрства адукацыі Беларусі перажывае адну з самых актыўных сваіх фаз

**Узбекістан, Кітай, Манголія, сустрэча міністраў адукацыі краін БРІКС у Казані. І гэта без уліку замежных калег, якіх прымала кіраўніцтва ведамства ў Беларусі, а таксама даўняга, цеснага і эфектыўнага ўзаемадзеяння з Міністэрствам навукі і вышэйшай адукацыі Расіі.**



Імпульс гэтым актыўнасцям надала спачатку сустрэча ў Пекіне лідараў Беларусі і Кітая ў канцы 2023 года, дзе яны абмяркоўвалі пытанні маладзёжнай палітыкі, студэнцкага абмену і інш. Тэма атрымала працяг і на сустрэчы кіраўніка дзяржавы з сакратаром партыйнага камітэта Пекінскага ўніверсітэта, старшынёй педагагічнага савета, намеснікам старшыні камісіі па міжнародных справах Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў Хаа Пінам, падчас якой Прэзідэнт падкрэсліў неабходнасць пашырэння камунікатыўных сувязяў паміж народамі ўвогуле і моладдзю ў прыватнасці.

## Кітай: толькі наперад, ні кроку назад

Адна з самых значных сустрэч гэтага года — вялікі візіт у Кітай дэлегацыі Міністэрства адукацыі, які пачаўся з наведвання калыскі кітайскай дыпламатыі: Пекінскага ўніверсітэта замежных моў. Аб рабоце беларускай дэлегацыі ў Кітаі і аб супрацоўніцтве з Паднябеснай у галіне адукацыі расказвае **міністр адукацыі Беларусі Андрэй ІВАНЕЦ:**

— Сёння супрацоўніцтва з Кітаем — адзін са стратэгічных вектараў нашага міжнароднага парадку дня. І гэта цалкам заканамерна, таму што яшчэ на зарнку сваёй незалежнасці, больш за 30 гадоў таму, мы ўстанавілі дыпламатычныя адносіны з КНР. Ужо тады кіраўнік дзяржавы бачыў і перспектыву, і патэнцыял гэтых адносін. І, як заўсёды, меў рацыю, таму што сёння Кітайская Народная Рэспубліка з'яўляецца другой эканомікай свету, там засяроджаны высокія тэхналогіі і навукаёмістыя вытворчасці. Усяго гэтага немагчыма было б дасягнуць без той развітой адукацыйнай сістэмы і яе дзяржаўнай падтрымкі, якія там былі створаны і паспяхова дзейнічаюць цяпер.

Мы сустракаліся з маім калегам, міністрам адукацыі, і абмяркоўвалі шэраг прынцыповых момантаў развіцця нашага супрацоўніцтва. Першы і вельмі важны — рэалізацыя сумесных адукацыйных праграм, якія дазваляюць выдаваць дыплом падвойнага ўзору, паміж універсітэтамі Кітая і Беларусі. Яны таксама дазваляюць выкарыстоўваць найлепшыя адукацыйныя тэхналогіі і напрацоўкі КНР і Беларусі, аб'яднаць іх пад патрэбы нашай эканомікі і вытворчасцяў, у тым ліку і сумесных, якія ствараюцца сёння ў рамках рэалізацыі такіх буйных праектаў, як індустрыяльны парк «Вялікі камень», беларуская нацыянальная біятэхналагічная карпарацыя і шэраг іншых.

Другое, што мы абмяркоўвалі, — развіццё навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва паміж нашымі ВНУ. У лістападзе мінулага года была створана асацыяцыя беларуска-кітайскіх універсітэтаў, а сёлета, у рамках візіту ў КНР, адбылося ўжо другое пасяджэнне гэтага аб'яднання. Падчас яго запушчана шэсць кластараў па тых кірунках, якія стануць падмуркам для распрацоўкі ўласных праектаў: інфармацыйныя тэхналогіі, інжынерныя спецыяльнасці і шэраг іншых. Іх трэба ўкараніць у рэальны сектар эканомікі, каб яны сталі асновай стварэння прадпрыемстваў, працоўных месцаў, і мы змаглі наладзіць выпуск новай, запатрабаванай не толькі ў нашай краіне, але і за яе межамі, прадукцыі.



Ну і трэці кірунак — гэта ў самым шырокім сэнсе гуманітарнае супрацоўніцтва. У Кітаі дзейнічаюць 12 цэнтраў вывучэння Беларусі.



Працуюць яны на базе ўніверсітэтаў, і там вывучаецца не толькі беларуская мова, але і наша культура, гісторыя, звычаі. У сваю чаргу, у Беларусі функцыянуюць інстытуты і кабінеты Канфуцыя, дзе вядзецца вывучэнне кітайскай мовы і кітайскай культуры ў цэлым. Гэта нас вельмі збліжае. І зблізіць яшчэ больш, калі ў рамках запланаванага ў жніўні візіту ў Беларусь прэм'ер-міністра КНР будзе прынята рашэнне аб стварэнні беларуска-кітайскага цэнтра гуманітарнага супрацоўніцтва.

Немалаважны яшчэ адзін аспект — маладзёжны абмен. Усе разумеюць — каб спазнаць краіну, лепш убачыць яе на свае вочы. Таму падчас візіту ў Кітай дасягнулі яшчэ адной важнай дамоўленасці: падрыхтуем пагадненне, згодна з якім на пастаяннай, сістэмнай аснове будзем абменьвацца групамі школьнікаў і студэнтаў. Наведаўшы памятныя, гістарычныя, культурныя мясціны нашых краін, яны больш даведаюцца пра іх, ды і для асабістага сяброўства гэта будзе добрай нагодай.

Увогуле, дынаміка развіцця адносін з кітайскімі калегамі — надзвычай высокая. Мы даваяем адно аднаму самае каштоўнае, што ў нас ёсць, — нашу моладзь. Колькасць кітайскіх студэнтаў, якія навучаюцца ў Беларусі, толькі за пяць гадоў вырасла з 6,5 да 11 тысяч. Два гады таму ў Кітаі вучыліся 150 нашых хлопцаў і дзяўчат. Цяпер — больш за дзве тысячы. А гэта азначае, што мы ўпэўнены не толькі ў якасці адукацыі абедзвюх краін, але і ў тым, што дзеці знаходзяцца ў бяспецы, камфорце і сяброўскай атмасферы.

## Педагагічныя кадры для Манголіі

Яшчэ адзін знакавы візіт прадстаўнікоў сістэмы адукацыі ў складзе ўрадавай дэлегацыі нашай краіны адбыўся ў Манголію.

Ён пачаўся з наведвання Мангольскага нацыянальнага ўніверсітэта адукацыі, дзе Андрэй Іванец і рэктар мангольскай ВНУ Батбаатар Джаміансурэн абмеркавалі ўзаемадзеянне паміж профільнымі ўніверсітэтамі. Асаблівая ўвага ўдзялялася перспектывам падрыхтоўкі педагагічных кадраў для Манголіі па прыродазнаўчанавуковых спецыяльнасцях. Андрэй Іванец выказаў гатоўнасць дзяліцца назапашаным вопытам па ўсіх кірунках, якія цікавяць мангольскі бок, у тым ліку па арганізацыі педагагічных класаў у школах.

Актывізацыя супрацоўніцтва ў падрыхтоўцы прафесійных кадраў для педагогікі і навукі ў цэлым — такая дамоўленасць была дасягнута паміж міністрамі адукацыі дзвюх краін. Таксама кіраўнік Міністэрства адукацыі і навукі Манголіі Энх-Амгалан Луўсанцэрэн пагадзіўся разгледзець пытанне ўдзелу беларускіх універсітэтаў у кароткатэрміновых адукацыйных праграмах. Дарэчы, сёння прамое ўзаемадзеянне паміж ВНУ Беларусі і Манголіі рэалізуецца ў рамках 12 міжуніверсітэцкіх дагавораў.

Галоўным вынікам мангольскіх сустрэч і перагавораў сталі падпісанне Пагаднення паміж урадамі Беларусі і Манголіі аб узаемным прызнанні дакументаў аб адукацыі, а таксама Дарожная карта супрацоўніцтва профільных міністэрстваў абедзвюх краін на 2024—2026 гады.

## Сустрэча міністраў адукацыі краін БРІКС

Буйное міжнароднае мерапрыемства «Фарміруючы будучыню» з удзелам кіраўнікоў і спецыялістаў Міністэрства адукацыі прайшло ў Казані. На ім прысутнічала больш чым 100 удзельнікаў з 40 краін, якія прадстаўляюць палову насельніцтва планеты.

На форуме ўзнімаліся пытанні міжнароднага адукацыйнага асяроддзя, сістэмы каштоўнасцяў, выхавання, ацэнкі якасці і даступнасці адукацыі. Падчас яго Андрэй Іванец сустрэўся з міністрам навукі і вышэйшай адукацыі Расіі Валерыем Фальковым. Кіраўнікі адукацыйных галін абмяркоўвалі пытанні стварэння сеткавага ўніверсітэта Саюзнай дзяржавы, аб'яднання намаганняў па сумесным удасканаленні інжынернай адукацыі. Сёння гэтая работа ідзе на базе Перадавой інжынернай школы Саюзнай дзяржавы — Пскоўскага ўніверсітэта. Абмеркавалі бакі таксама арганізацыю ў 2025 годзе Маладзёжнага форуму Саюзнай дзяржавы і фестывалю студэнцкай самадзейнай творчасці «Студэнцкая вясна Саюзнай дзяржавы».

У Казані таксама міністры адукацыі Беларусі і Егіпта дамовіліся аб супрацоўніцтве ў падрыхтоўцы кадраў па найбольш запатрабаваных у афрыканскай краіне спецыяльнасцях інжынернага профілю: у машынабудаванні, мікраэлектроніцы і гэтак далей. Нагадаем, што сёння прамое ўзаемадзеянне паміж установамі адукацыі Беларусі і Егіпта рэалізуецца ў рамках 11 дагавораў аб супрацоўніцтве.

Акрамя таго, прайшлі перагаворы з міністрам асветы Расійскай Федэрацыі Сяргеем Краўцовым і намеснікам міністра адукацыі Кітая Чэнь Цзэ, а таксама адбыліся сустрэчы з дэлегацыямі КНР, ПАР, Кубы, Рэспублікі Сербскай, Шры-Ланкі, Узбекістана.

**Алена ВІНАГРАДАВА.**
**Фота прэс-службы Міністэрства адукацыі.**

## Яны размаўляюць на адной мове

**Ігар МАРЗАЛЮК, старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь:**

— Паміж Беларуссю і Кітаем устаноўлена ўсепагоднае і ўсебаковае стратэгічнае партнёрства, у яго аснове — узаемная павага, палітычны давер і сяброўства. У нас абсалютнае супадзенне — па ўсіх параметрах, па ўсіх сферах. І тое, што ўзаемадзеянне з КНР расце і ўмацоўваецца ў такой важнай галіне, як адукацыя, мае надзвычай важнае значэнне. Колькасць кітайскіх студэнтаў, якія навучаюцца ў Беларусі, пастаянна расце, прычым у апошнія гады ўсё больш з іх выказваюць жаданне перайсці на другі ўзровень адукацыі — магістратуру — і таксама ў нашых установах адукацыі. Гэта сведчыць аб тым, што краіна, якая прэтэндуе на лідарства ў свеце па многіх пазіцыях, прызнае не толькі якасць і камфортнасць навучання ў беларускіх ВНУ, але і бяспеку знаходжання ў беларускіх гарадах. Дзякуючы гуманітарнаму супрацоўніцтву, студэнты ў Кітаі загаварылі на нашай роднай мове, а беларуская моладзь — на кітайскай. Яны вучаць не толькі мовы, але і культуру, звычаі дзвюх краін. Але самае галоўнае ведаеце што? Тое, што насамрэч яны размаўляюць на адной мове — узаемнай павагі, роўнасці і высокіх агульначалавечых якасцяў.